## Фельетон. Актыўнасць наадварот

Прастата і яснасць аб'явы збівалі напавал: у пятніцу—прафсаюзны сход! Але знешніх прыкмет непакою не назіралася. Адчувалася, што і З. Вазжаннікава, і Л. Сыраквашка, і нават першакурсніца Зіна Дабрыян глыбока прадумалі гэтае хвалюючае пытанне і прынялі беспаваротнае рашэнне.

Катастрофа выбухнула ў дзве гадзіны дня—адразу ж пасля лекцый. Ведаючы з вопыту папярэдніх сходаў, што малейшае прамаруджванне да смерці падобна і можа аказацца ракавым, яны разам з іншымі філфакаўцамі ў адзіным парыве кінуўся да выхаду.

Усё было загадзя разлічана да дробязі: паліто ўзяты з гардэробу на папярэднім перапынку, пільнасць мясцовых прафсаюзных «босаў» прытуплена шчырымі абяцаннямі абавязкова прысутнічаць на сходзе. І вось усе ў баявой гатоўнасці і чакалі сігнала (заўсёды радуючага студэнта званка).

Час прабіў. Але... «вольналюбівыя імкненні» нечакана напаткалі перашкоду.

Стройнымі радамі стала ля выхаду прафсаюзнае бюро і мужна процістаяла націску студэнтаў.

Закрыўшы амбразуру дзвярэй уласнай спіной, член прафкамітэта Міхаіл Папоў гераічна адбіваў узмацняўшыяся атакі. На дапамогу яму спяшаліся адказныя камсамольскія работнікі. Тады барацьба прыняла зусім іншы напрамак. Успамінаюцца ўсе трэніроўкі, рэпетыцыі і іншыя камсамольскія даручэнні, якія сёння, зараз жа патрабуюць неадкладнага выканання!

Паяўляецца і шэраг цяжка захварэўшых родзічаў, стан здароўя якіх патрабуе неадкладнага і сталага догляду. І толькі паяўленне на сцэне дзеяння намесніка дэкана Р. В. Булацкага ўносіць пэўную яснасць у стварыўшаеся становішча. Атакі адбіты. Актавая зала паступова напаўняецца. І толькі многіх, быццам магніт, цягнуць да сябе вокны першага паверха. І калі герой Лермантава Сашка, дзякуючы ім, здолеў знайсці выйсце з больш цяжкага становішча, дык хіба ж нельга выкарыстаць вокны і нашым «героям»? Далей было зусім, як у паэме: «Прыг-прыг, —и были таковы!».

Заграджальная камісія святкуе перамогу—сход пачынаецца. Ура! Пачынаецца сход. 3 646 членаў прафсаюза 300 усё-такі прысутнічаюць! Няхай жыве масавасць!

**Ж. ЮШКЕВІЧ.**

## СПОРТ
### *Спартакіяда ў інтэрнаце*

**У ліку запланаваных мерапрыемстваў студсавета інтэрната матэматыкаў і біёлагаў былі мерапрыемствы па папулярызацыі спорту. Мы рашылі праводзіць штогод спартакіяду ў нашым інтэрнаце. Спартакіяда праходзіць па шасці відах спорту: баскетболу, валейболу, шахматах і шашках, стральбе і настольнаму тэнісу.**

**Ужо закончыліся гульні па чатырох відах спорту. Ва ўпартай барацьбе прайшло першынства па баскетболу сярод мужчын. Першае месца заняў дружны калектыў чацвертага паверху. Гэтая каманда атрымала прыз—баскетбольны мяч. Сярод жаночых каманд упэўненую перамогу атрымала зборная каманда першага і другога паверху. У валейбалістаў перамагла каманда другога паверху.**

**Вельмі вострай была барацьба у жанчын. Першыя—трэція месцы раздзялілі каманды другога, трэцяга і чацвертага паверхаў, набраўшыя па два ачкі. Па суадносінах матчаў пераможцам стала каманда трэцяга паверху. Сярод тэнісістаў першае месца заняла каманда другога паверху.**

**Вельмі ўпарта і цікава праходзілі спаборніцтвы стралкоў. Вынікі каманд вельмі шчыльныя. Выбіўшы 914 ачкоў, уперад выйшла каманда другога паверху.**

**Спартакіяда выклікала велізарную цікавасць сярод студэнтаў. Толькі ў спаборніцтвах па першых 4 відах спорту прыняло ўдзел каля 200 чалавек.**

**Г. ДРАБУШЭВІЧ,**
**старшыня прафбюро матэматычнага факультэта.**



ВОСЕНЬ... **Фотаэцюд А. Шрубка.**

### ІДЗЕ ПАПАЎНЕННЕ

Ажыўлена было ў кабінеце мовазнаўства. Тут сабраліся ўдзельнікі гуртка па вывучэнню беларускага фальклору, якім кіруе выкладчыца тав. Багрова. Студэнтаў было многа. Адных толькі першакурснікаў прышло больш 50.

З дакладам «Беларускія прыказкі аб рэлігіі і служыцелях культу» выступіў студэнт 3-га курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры І. Казак. Пасля дакладу разгарнуліся гарачыя спрэчкі.

Студэнты-першакурснікі не толькі з вялікай увагай праслухалі, даклад, але і самі рашылі прыняць удзел у рабоце гуртка.

**М. КІСЯЛЕВІЧ.**

# Месяц на цаліне

Тройчы разам з іншымі пасланцамі універсітэта я працаваў на уборцы цаліннага ўраджаю. І, прызнацца, крыху стала сумнавата, калі даведаўся, што больш не будуць пасылаць студэнтаў на цаліну. Значыць, не так трэба там ужо нашы рукі. І брала цікавасць—якая яна цяпер, былая цаліна, абжыты зараз край?

У канцы ліпеня даведаўся, што з Беларусі на дапамогу казахстанскім хлебаробам накіроўваюцца механізатары. Разам з імі ўдалося паехаць і мне.

Нас камандзіравалі ў Паўночна-казахстанскую вобласць. З горада Петрапаўлаўска мы раз'язджаліся ў калгасы і саўгасы. Адно ўражанне змянялася другім. Нярэдка аўтамашыны праязджалі каля азёр, кругла сінеючых на 2—3—5 кіламетраў. А ўраджай! Пaабапал дарогі ад малейшага подыху ветра хвалявалася густая, яшчэ зялёная пшаніца, вітала беларускіх пасланцоў сваімі шырокімі лістамі амаль трохмятровая кукуруза і жоўтымі вясёлымі ўсмешкамі—сакавіты сланечнік.

Сяло Троіцкае раскінулася вакол прэснага і неглыбокага возера з крыху пакрытым ілам, але амаль цвёрдым дном. Наогул у паўночным Казахстане вельмі многа бясsuccточных азёр, багатых сібірскім карасём і дзічынай. На такіх азёрах мы бачылі, як акінуць вокам, гушкаючыхся качак, якія здалёк здаваліся цёмнымі кропкамі. Азёры напалову зараслі сітняком, які выкарыстоўваецца пры будаўніцтве стандартных домікаў і іншых пабудоў.

10 жніўня ўсе дзевяць хлапцоў Барысаўшчыны ўключыліся ў дружны працоўны калектыў калгаса-мільянера. Тры дні прасушвалі і сціртавалі сена, а потым нас разаслалі па брыгадах. Мне выпала быць з аднавяскоўцам 18-гадовым трактарыстам Віктарам Вінцярэвічам. Гэтаму юнаку яшчэ не прыходзілася выязджаць за межы свайго раёна, і паехаў ён з дому, не сказаўшы нават маці, куды, і толькі з дарогі тэлеграфаваў: на цаліну.

Да гэтага часу ў брыгадзе ішла падборка аўса, і брыгадзір паслаў нас працаваць на камбайны. Першы наш дзень у першай брыгадзе. Працавалі за поўнач, выканалі больш чатырох норм і выпрацавалі 6,5 працадня. «Як цаліна, Віця?»—запытаўся я ў сябра, калі ўкладваліся спаць. «Брыгада сёння намалаціла столькі аўса, колькі ў нашым калгасе намалочваюць на ўвесь год»,—адказаў Віктар.

Пасля заканчэння падборкі аўса больш тыдня працавалі на сіласаванні кукурузы. Камбайны наразалі па 100—130 тон масы за дзень, а тут стой у кузаве і толькі паспявай разгортваць і ўтоптваць няспынна паступаючую з ленты агрэгата зялёную масу. Кукуруза вышэй за трактар і нават за аўтамашыну і толькі па выкідваючай масу страле камбайна можна прыкмеціць месцазнаходжанне агрэгата. Праходзіць 10—15 мінут—і 2,5-тонны «ГАЗ-51» або 3,5-тонны «ЗІС-150» адыходзяць ад сіласнай ямы.

Жылі ў брыгадным стане—за 4 кіламетры ад сяла. Па заканчэнню работы вечарамі хадзілі ў клуб калгаса. У клубе—стацыянарная кіноўстаноўка. У двары—баскетбольная і валейбольная пляцоўкі.

Неяк два дні запар імжэў дождж, і мы пераехалі ў сяло. Жылі ў хаце брыгадзіра Івана Іосіфавіча Лебедзева. Тут я пазнаёміўся з бацькам брыгадзіра 70-гадовым Іосіфам Лебедзевым. Стары ў вольны час вырабляў граблі і іншыя прылады. Ён—заядлы рыбак. Амаль кожны вечар і раніцу прыносіў па кашу шырокіх карасёў. Ад яго ж я даведаўся аб гісторыі сяла Троіцкага. Год 90 таму назад з-пад Варонежа, з Украіны, сюды прыехалі перасяленцы і пачалі будавацца вакол возера. Сяло дабудоўвалася ў пачатку XX стагоддзя, у перыяд сталыпіншчыны. Пасля Кастрычніка вандроўнікі-казахі асядалі побач з рускімі і украінцамі.

У брыгадзе з намі падоўгу гутарыў вартаўнік зернесклада 65-гадовы беларус Раман Пашкоўскі. Калі «дзядзька Раман» (як звалі яго ў брыгадзе) быў яшчэ хлапцом, у пачатку першай сусветнай вайны, яго сям'я з-пад Беластоку пераехала ў Казахстан. Як філолаг, я заўважыў старому на яго украінскае вымаўленне (тыпу «паіхалы»). «Забыв,—усміхнуўся Раман,—ось вас розумію, а сам не ўмію».

Самы напружаны час чакаўся з пачаткам уборкі пшаніцы. А яна, густая і шумлівая, шапацела бяскрайнімі хвалямі.

Хлопцы-беларусы працавалі лафетчыкамі і трактарыстамі, скошвалі за дзень па 25—30 гектараў.

І вось першага верасня больш двух дзесяткаў самаходных і прычэпных камбайнаў калгаса «Жыццё» пачалі падборку пшанічных валкоў. Цяпер мы працавалі памочнікамі камбайнераў. Наш агрэгат пры добрым надвор'і падбіраў па 17—24 га валкоў (норма—16 га). Іншыя—яшчэ больш.

І толькі тэлеграма ад сяброў «Заняткі пачаліся» прымусіла мяне 9-га верасня пакінуць гэты цудоўны багаты край.

**П. ВАЛКАВЕЦ,**
**студэнт III курса філфака.**

### З ПОШТЫ «БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА»



**Гэтым летам мне давялося пабываць на практыцы з геафізічнай экспедыцыяй на поўдні Гомельскай вобласці, на беларускім Палессі. Аднойчы адзін з супрацоўнікаў экспедыцыі знайшоў гняздо перапелкі. Маленькія шэрыя шарыкі пакаціліся ў розныя бакі. Адно птушанё мы злавілі. Яно супакоілася ў цёплых далонях чалавека. Такім я яго і сфатаграфаваў.**

**А. ЛУКАШОЎ.**


## А Б ' Я В А

**Прафесары, выкладчыкі і аспіранты вышэйшых навучальных устаноў! Чытайце штомесячна часопіс «ВЕСТНИК ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ»—орган Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыіі СССР.**

**У часопісе асвятляюцца актуальныя праблемы вышэйшай адукацыі, расказваецца аб вопыце вышэйшых навучальных устаноў па перабудове вучэбна-выхаваўчай работы, на аснове злучэння навучання з вытворчай працай.**

**Чытач знойдзе тут артыкулы аб падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў, па гісторыі айчыннай педагагічнай думкі, даведаецца аб новай вучэбнай літаратуры, пазнаёміцца з зарубежнай вышэйшай школай.**

**У «Вестнике высшей школы» супрацоўнічаюць вядомыя вучоныя, дзеячы вышэйшай школы, работнікі грамадскіх арганізацый.**

**На часопіс «Вестник высшей школы» можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленні або ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку. Падпісная цана—60 рублёў на год, 30 рублёў на паўгода.**

**НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА НА ЧАСОПІС «ВЕСТНИК ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ»!**



Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 10801. Зак. 1510 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.